УДК 82-1(417) "19"

І.В. Поўх

АДЛЮСТРАВАННЕ ІДЭІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ Ў ПАЭЗІІ ШЭЙМАСА ХІНІ

У артыкуле праводзіцца аналіз творчасці 1960-х – 1990-х гадоў ірландскага паэта XX стагоддзя, лаўрэата Нобелеўскай прэміі па літаратуры 1995 г. Шэймаса Хіні з мэтай выяўлення асноўных тэматычных ліній, матываў і вобразаў, што выступаюць сродкам адлюстравання ідэі нацыянальнай самасвядомасці. Аўтар вылучае тры тэматычныя лініі: гістарычнае мінулае сваёй краіны, народны побыт, міфалогія і фальклор, у межах якіх разглядаюцца матывы багны, раскопак, навакольнага асяроддзя, страты і пошуку радзімы і інш. Робіцца выснова аб прыярытэтнасці тэматычных ліній гістарычнага мінулага і народнага побыту, эпізадычнасці і дапаўняльнай функцыі міфалагічных і фальклорных сюжэтаў і вобразаў у паэзіі Шэймаса Хіні вышэйадзначанага перыяду.

Ідэя нацыянальнай самасвядомасці займае значнае месца ў творчасці ірландскага паэта XX стагоддзя, лаўрэата Нобелеўскай прэміі па літаратуры 1995 г. Шэймаса Хіні (нар. у 1939). Яна развіваецца ў межах пэўных тэматычных ліній, асноўнымі з якіх з'яўляюцца гістарычнае мінулае сваёй краіны, народны побыт, міфалогія і фальклор.

У творчасці Шэймаса Хіні лінія гістарычнага мінулага Паўночнай Ірландыі –адна з найбольш распрацаваных тэм. У першых зборніках яна мае эпізадычны характар, а ўжо ў трэцім зборніку вершаў паэта «Узімку на свежым паветры» («Wintering Out») выступае ў якасці лейтматыву. Тэма гістарычнага мінулага краіны раскрываецца праз шэраг скразных матываў, цэнтральнымі з якіх выступаюць матыў багны (зямлі) і матыў раскопак. Багна атрымлівае ў Ш. Хіні бінарную трактоўку: з аднаго боку, яна ўтрымлівае матэрыяльныя каштоўнасці, з другога – захоўвае для нашчадкаў культурную спадчыну чалавецтва, «патопленую» ў шэрагу гістарычных падзей; усё, што трапляе ў багну, гіне фізічна, але ў той жа час захоўваецца ў сваім першапачатковым выглядзе; багна, такім чынам, выступае сродкам паяднання светапоглядаў дзвюх эпох – мінулага і сучаснасці.

Матыў раскопак з'яўляецца ўжо ў першым вершы першага зборніка. Верш «Раскопкі» звязаны не з археалогіяй, а з больш «празаічным», блізкім фермеру заняткам – пасадкай бульбы. І багна на гэтым этапе яшчэ не сімвал мінулага, а толькі месца здабычы дзёрну, у шырокім сэнсе – крыніца сродкаў на існаванне.

Мой дзед у дзень выкопваў дзёрну больш,	My grandfather cut more turf in a day
чым хто на балотах Тонера.	Than any other man on Toner's bog [1, с. 3].

Пачынаючы са зборніка «Дзверы ў цемру» («Door into Dark»), матыў багны становіцца самастойнай тэмай. Багна персаніфікуецца, звяртаецца да чытача ад уласнага імя (верш «Ундзіна» («Undine»)), адкрывае людзям свае скарбы (верш «Багна» («Bogland»)). У зборніках «Узімку на свежым паветры» і «Поўнач» («North») матыў багны раскрываецца праз новыя вобразы – целы людзей, патопленых у багне падчас старажытных кельцкіх рытуалаў, куды ўваходзілі чалавечыя ахвярапрынашэнні, у якіх Ш. Хіні бачыць сімвалы здрады, помсты і разбурэння ў сучаснай яму Ірландыі (вершы «Людзі балота» («The Bog People»), «Чалавек з Толанда» («The Tollund Man»), «Чалавек з Граўбаля» («The Grauballe Man»)). Так, літаратуразнаўца Хелен Вендлер адзначае «прыраўноўванне сярэднявечнага трупа да "чатырох маладых братоў", забітых у пачатку 1920-х гг. дапаможным паліцэйскім атрадам» [3, с. 34].

Навуковы кіраўнік Камароўская Т.Я. – доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры рускай і замежнай літаратуры Установы адукацы «Беларускі дзяржаўны педагагічны унівесітэт імя М. Танка»

Репозиторий БрГУ

Зборнік «Поўнач» складаецца з двух раздзелаў. Першы ў асноўным прысвечаны старажытнаму перыяду, у прыватнасці Ірландыі часоў вікінгаў, які быў адкрыты дзякуючы археалагічным раскопкам балот Ютландыі. Другая частка сканцэнтравана на праблемах сучаснай Паўночнай Ірландыі. Тэматычнае ядро зборніка складаюць шэсць «паэм балота» – «Прыйдзі ў альтанку» («Come to the bower»), «Пакаранне» («Punishment»), «Каралева балота» («Bog Queen»), «Чалавек з Граўбаля», «Незвычайны плод» («Strange Fruit») і «Роднасць» («Kinship»). Вобразы «людзей балота» паступова набываюць індывідуальнасць, непадобнасць адзін да аднаго, упершыню ўспрымаюцца не як агульны натоўп, нешта вельмі далёкае і таму абстрактнае, а як канкрэтныя лёсы канкрэтных людзей («Незвычайны плод»), з'яўляюцца не толькі напамінам пра мінулае, часткай яго, але складаюць адзінае цэлае з людзьмі, што гінуць у сучаснай паэту Паўночнай Ірландыі («Роднасць»).

«Паэмы балота» становяцца «паваротным момантам» зборніка. Калі ў першай частцы кнігі асноўная ўвага надавалася гісторыі Скандынавіі і яе сувязі з гісторыяй Паўночнай Ірландыі, то другая частка поўнасцю засяроджана на Паўночнай Ірландыі, у прыватнасці на аналізе падзей, што адбываліся ў Ольстэры, і іх перадумоў. У «Паэмах балота» сувязь паміж эпохамі – не прымха паэта ці выпадковае супадзенне, а заканамернасць, што вынікае з агульных культурных і маральных каштоўнасцяў. Жорсткасць грамадства да канкрэтных людзей гістарычна абумоўлена наяўнасцю аналагічных прыкладаў у абрадах старажытных кельтаў. Але для Ш. Хіні гэта зусім не апраўданне сітуацыі, што склалася, а стымул для барацьбы з ёй.

Паралелі паміж культурамі і эпохамі яскрава выступаюць у вершах з другой часткі зборніка: абрад пахавання ў вершы «Пахавальны абрад» («Funeral Rites») выклікае асацыяцыі з палітычным гвалтам, а таксама з забойствамі сярод старажытных вікінгаў; у вершы «Дублін вікінгаў: Пробныя кавалкі» («Viking Dublin: Trial Pieces») знойдзены пры раскопках кавалачак косці дапамагае аднавіць пэўную эпоху, этап у жыцці чалавецтва.

Тэматычная лінія гістарычнага мінулага атрымлівае міфалагічную афарбоўку ў вершы «Саюзны акт» («Act of Union»). Ён прысвечаны акту 1800 г., згодна з якім было створана Аб'яднанае Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі. Верш пабудаваны на алегорыі. Ірландыя выступае ў вобразе міфічнай істоты.

Хрыбет – жорсткая лінія	Your back is a firm line of eastern coast
ўсходняга ўзбярэжжа,	And arms and legs are thrown
рукі і ногі раскіданы	Beyond your gradual hills [1, с. 120].
па ўзгорках.	

Першы раздзел верша адлюстроўвае стаўленне аўтара да таго, што ўжо адбылося, да мінулага. Другі раздзел прысвечаны сучаснасці. Міфічная істота ўжо не толькі існуе, яна змагаецца з другой, што ўзнікла ў выніку «выбуху багны» («a bog-burst»), з Актам. Акт у Ш. Хіні – жывая істота, вельмі моцная, што «з кулакамі накідваецца» («His parasitical / And ignorant fists already / Beat at your borders») на межы Ірландыі і насцярожана ставіцца да самога паэта, нібыта адчуваючы небяспеку, што ідзе ад апошняга. Але разам з тым Ш. Хіні разумее незваротнасць таго, што адбылося, што не будзе і не можа быць новага акта, здольнага «вылечыць параненае цела» Ірландыі,

вялізную рану,	the big pain
што крывёю сцякае,	That leaves you raw, like opened ground, again
бы разрытая глеба.	[1, с. 120].

Матыў раскопак з'яўляецца ў пачатку і напрыканцы верша, абрамляючы яго («выбух багны», што выклікаў з'яўленне Акта, у першай частцы і «разрытая глеба» ў другой) і тым самым яшчэ больш выяўляючы сваю ролю як неад'емнай часткі тэмы

Репозиторий БрГУ

гістарычнага мінулага.

У наступных зборніках («Праца ў полі» («Field Work»), «Востраў Стэйшн» («Station Island»)) асаблівая ўвага надаецца прадметам як сімвалам мінулага. Гэта знойдзеныя пры раскопках рэшткі фігурак паганскіх часоў (верш «На ўскрайку вады»), камяні (цыкл вершаў «Жыццё на паліцы» («Shelf Life»)), вастрыё кап'я (верш «Стары прас» («Old Smoothing Iron»)).

Адна з асаблівасцяў творчасці Шэймаса Хіні – зварот да міфалагічных вобразаў і сюжэтаў, пра што сведчаць міфалагічная істота з верша «Саюзны акт», паданне пра караля-вар'ята Суіні, пакладзенае ў аснову паэмы «Блуканні Суіні» («Sweeney Astray») і цыкла вершаў «Вяртанне Суіні» («Sweeney Redivivus»), вобразы русалкі з аднайменнага верша, Пана з верша «Метро» («The Underground»). Агульным для гэтых вершаў з'яўляецца наяўнасць матываў страты і пошуку, у прыватнасці страты і пошуку радзімы. Кароль Суіні страчвае розум і шукае прытулак, русалка шукае скрадзеную ў яе чароўную вопратку, без якой яна не можа вярнуцца ў мора, лірычны герой верша «Метро» імкнецца дагнаць жанчыну ў метро:

быццам бог флейты ў пагоні	like a fleet god gaining
за ёй, пакуль у трысцё не	Upon you before you turned to a reed
ператварылася.	[1, с. 201].

Адзначаныя вышэй вершы аб'ядноўвае і пачуццё безнадзейнасці, фатальнасці сітуацыі, у якой знаходзіцца кожны з лірычных герояў. Вандроўны кароль вяртаецца на радзіму, дзе памірае гвалтоўнай смерцю: яго забівае дзіда, пушчаная рукой зайздросніка. Русалка, не здолеўшы вярнуць сваю чароўную вопратку, вяртаецца ў мора і тоне. Лірычны герой верша «Метро», не дагнаўшы незнаёмку, кіруецца за ёй па сцежцы з гузікаў,

каб скончыць свой шлях між	To end up in a draughty lamplit station
скразнякоў і лямпаў святла на станцыі,	After the trains have gone [1, с. 201].
як пройдуць цягнікі.	

Магчыма, праз гэтыя вобразы паэт раскрывае чытачу лёс выгнаннікаў, эмігрантаў, якіх шмат было ў гісторыі Ірландыі (дастаткова ўзгадаць масавыя эміграцыі пачатку XIX стагоддзя і сярэдзіны 40-х гг. XIX ст., выкліканыя голадам і беспрацоўем, а таксама вымушаныя эміграцыі па палітычных матывах напачатку XX стагоддзя).

Тэматычная лінія народнага побыту з'яўляецца адной з цэнтральных у творчасці Шэймаса Хіні. Даследчыкі [2, 3] падкрэсліваюць пэўную пастаральнасць, уласцівую вершам, што належаць да гэтай тэматычнай лініі. Адначасова з гэтым літаратуразнаўца Д. Кіберд адзначае жорсткасць мастацкага бачання Ш. Хіні, што «прышпільвае кожны вобраз да памяці, бы матыля да паперы» [2].

Тэматычная лінія народнага побыту раскрываецца праз вобразы людзей, між якіх прайшло дзяцінства паэта («Мужчына і хлопчык» («Man and Boy»), «Погляд на рэчы» («Seeing Things»), «Жнівеньская ноч» («An August Night»)), апісанне навакольнага асяроддзя і знаёмства дзіцяці з прыродай праз апавяданні дарослых, народныя прыкметы, уласныя эксперыменты і назіранні («Смерць натураліста» («Death of a Naturalist»), «Клець» («The Barn»)), а таксама тыповыя заняткі ірландскіх сялян: пасадку і выкопванне бульбы, здабычу дзёрну («Раскопкі» («Digging»)), збор ажыны («Збор ажыны» («Blackberry-Picking»)), збіванне масла («Дзень, калі збіваюць масла» («Churning Day»)) і інш.

Адметнай уласцівасцю вершаў, прысвечаных апісанню навакольнага асяроддзя, у якім прайшло дзяцінства паэта, з'яўляецца наяўнасць негатыўнай канатацыі, варожасці прыроды да чалавека, што адлюстроўваецца ў асноўным праз сістэму лексічных сродкаў выразнасці. Так, жабы ў вершы «Смерць натураліста» – «злосныя», «пузатыя» («angry», «gross-bellied»), нясуць у сабе «незразумелую пагрозу» («obscene

Репозиторий БрГУ

threats») [1, с. 5]; павуцінне «забівае лёгкія» («Then you felt cobwebs clogging up your lungs»), вочы кажаноў «поўныя злосці» («fierce»), мяхі з зернем «паўзлі сюды, бы статак пацукоў» («The two-lugged sacks moved in like great blind rats») (верш «Клець») [1, с. 6]; грыбок, што выклікаў раптоўную змену знаёмага смаку ягад («Збор ажыны») [1, с. 7]. Разам з тым паэт падкрэслівае нерэальнасць, надуманасць гэтай варожасці. Так, у вершах «Клець» і «Смерць натураліста» лірычны герой адштурхоўвае прыроду не з-за нейкай канкрэтнай пагрозы, што рэальна існуе і сыходзіць ад яе, а толькі ў выніку гульні ўяўлення. Ён бачыць самога сябе няпрошаным госцем са свету людзей і чакае нападу ў адказ ад прыроды.

Варта адзначыць і падрабязнасць, дэталізаванасць апісання людзей і іх тыповых заняткаў. Так, напрыклад, у вершы «Сонечнае святло» з цыкла «Масбон: два вершы-прысвячэнні» («Mossbawn: Two Poems in Dedication») Ш. Хіні стварае паэтызаваны вобраз жанчыны-сялянкі, сваёй цёткі Мэры. Паэт паказвае яе за характэрнай для любой ірландкі працай: то яна пячэ хлеб, стоячы ў абсыпанай мукой вопратцы ля акна, то выцірае пыл з мэблі, то проста сядзіць адпачываючы. Ш. Хіні вельмі дэталёва, да дробязяў адлюстроўвае кожны рух, абставіны, быццам непасрэдна назіраючы за тым, што адбываецца. У адрозненне ад ранніх вершаў, тут паэт цёпла, з любоўю ставіцца да праяў штодзённага жыцця. «Сонечнае святло» («Sunlight») – сімвал святла, цеплыні, якой хапае на ўсіх вакол. Сонца і цеплыня неаднаразова згадваюцца і непасрэдна ў тэксце («залітая сонцам адсутнасць» («sunlit absence»), «сонца стаяла, / бы скаварада, што астывала / ля сцяны» («and the sun stood / like a griddle cooling / against the wall»), «дыск цеплыні» («plaque of heat»)). Вынік падведзены ў апошняй страфе:

І там ёсць любоў,	And here is love
што з жалезным каўшом,	like a tinsmith's scoop
бліснуўшы, у бочцы	sunk past its gleam
з мукой патанула.	in the meal-bin [1, с. 93].

Другі верш цыкла распавядае пра сялян, што рэжуць бульбу на насенне. Ён адзін з нешматлікіх, дзе Ш. Хіні не паказвае свайго стаўлення да таго, што адбываецца. Паэт толькі падкрэслівае апошнім радком звычайнасць, тыповасць дзеянняў сялян:

З усімі намі, безыменнымі.	With all of us there, our anonymities [1, с. 94].

У цыкле вершаў «Ачышчэнне» («Clearances») паэт зноў звяртаецца да вобразаў дзяцінства, да рэчаў і людзей. Гэта і маленькія сакрэты, якім вучыла яго цётка, і вобраз прабабкі, і многае іншае. Цыкл складаецца з прадмовы і васьмі вершаў, кожны з якіх уяўляе сабой замалёўку з сялянскага жыцця. Характэрная асаблівасць творчай манеры Ш. Хіні – дэталізаванасць апісання абставінаў, дзеянняў, людзей – захоўваецца і ў гэтым цыкле. У якасці прыкладу можна прывесці апісанне абірання бульбы (верш III), велікоднага тыдня (верш VI). Магчыма, у гэтым простым, немудрагелістым ладзе жыцця паэт знаходзіць духоўнае ачышчэнне, вызваленне. Ён вяртаецца да таго, ад чаго шукаў выратавання ў ранняй творчасці – хатняй утульнасці, сям'і.

У зборніку «Дзверы ў цемру», як і ў першым зборніку, Шэймас Хіні раскрывае таямніцы розных прафесій, паэтызуючы штодзённае жыццё людзей. Кнігу адкрываюць вершы «Кузня» («The Forge») і «Страхар» («Thatcher»). Знешне яны – спакойныя, напоўненыя веліччу замалёўкі на тэмы сялянскага жыцця. Але напружанне з'яўляецца і тут, хоць па сваёй прыродзе яно і адрозніваецца ад дысанансаў першага зборніка. У зборніку «Смерць натураліста» канфлікт назіраецца паміж рэальнымі аб'ектамі і з'явамі, з аднаго боку, і эмоцыямі, якія яны выклікаюць у лірычнага героя, з другога. У вершах другога зборніка стаўленне лірычнага героя да аб'ектыўнай рэчаіснасці перадаецца не праз прамое апісанне пачуццяў і адчуванняў, а шляхам выкарыстання яскравых метафар. Так, кавадла ў кузні з'яўляецца перад чытачом, быццам аднарог і адначасова алтар, выклікаючы тым самым жах і глыбокую пашану («Кузня»), насенне

Репозиторий БрГУ

«жорсткае, бы дроб» («hard as shot») («Апавяданне жонкі» («The Wife's Ta1e»)) [1, с. 25].

Паступова побыт і штодзённае жыццё Ірландыі становяцца асновай для іншых тэматычных ліній. Так, у «Лох-Нейскім цыкле» вершаў («A Lough Neagh Sequence») апісанне побыту рыбакоў становіцца асновай для тэмы гісторыі, пахаванай у багне. Пачынаючы з «Лох-Нейскага цыкла», Ш. Хіні ўжо не толькі адлюстроўвае ў вершах жыццё людзей, але і звязвае яго з працэсамі, што адбываюцца ў Сусвеце. У тэматычнай лініі навакольнай рэчаіснасці і побыту з'яўляюцца філасофскія матывы. У аснову «цыкла» пакладзена натуральная паслядоўнасць узаемадзеяння чалавека і прыроды. Ужо ў паўторы радка «Штогод Лох-Ней сваю ахвяру знойдзе» («The lough will claim a victim every year») [1, с. 29] у моцнай пазіцыі ў пачатку і напрыканцы верша «Уверх па ўзбярэжжы» («Up the shore»), якім пачынаецца цыкл, утрымліваецца напамін пра тое, што ўсё жыццё падпарадкавана рытмічнаму цыклу сыходу і вяртання. Рытмічны паўтор адных і тых жа дзеянняў, «гірлянды», кружэнне становяцца скразнымі вобразамі, праходзяць праз увесь цыкл.

Вёслы ачэрчваюць колы старанна.	The oars in their locks go round and round.
Вугры выгінаюцца бесперастанна.	The eel describes his arcs without a sound [1, с. 32].

Ідэя аднастайнасці перадаецца і праз вобраз вугроў – «клубка спінак і брушак» («a knot of back and pewter belly») [1, с. 33], і праз вобраз рыбакоў, для якіх кожны дзень, месяц падобны да папярэдняга. Верш «Плантацыя» («The Plantation») з гэтага ж зборніка падводзіць вынікі развіцця гэтай ідэі.

Хоць прама ідзеш ты, але,	Though you walked a straight line
Магчыма, навокал блукаеш,	It might be a circle you travelled
Дзе пні і паганкі ўсё тыя ж.	With toadstools and stumps
	Always repeating themselves [1, с. 38].

Вобразы водных істот, што становяцца ахвярамі людзей, сустракаюцца і ў іншых вершах Шэймаса Хіні (амары ў вершы «Прэч ад усяго» («Away from it all»), вустрыцы ў аднайменным вершы). Магчыма, у вобразе гэтых істот Ш. Хіні ўяўляе сваю краіну, Ірландыю, і людзей, што насяляюць яе. Як і амары, вугры, вустрыцы, яны былі «злоўлены» Брытаніяй, уз'яднаныя з Каралеўствам. Яны «пазбаўлены вады», свайго звыклага асяроддзя, звыклага ладу жыцця, сваёй рэлігіі. Пазбаўленыя свайго асяроддзя, людзі моцнай, са сваімі каранямі і традыцыямі нацыі губляюцца і таму становяцца асабліва лёгкай здабычай.

У зборніку «Вяртанне Суіні» тэма побыту атрымлівае нечакана новы паварот. Ферма становіцца «першым каралеўствам», дзе ўсё цудоўна, нязвыкла і паэтызавана (верш «Першае каралеўства» («The First Kingdom»)) [1, с. 251]. «Каралеўства» – гэта тое месца, гаспадаром якога ўпершыню адчувае сябе чалавек, адкуль пачынаюцца яго веды пра свет. Апісанне ў Ш. Хіні традыцыйна падрабязнае і дэталізаванае. Але сцежкі, пратаптаныя каровамі, уяўляюцца лірычнаму герою і чытачу «каралеўскімі дарогамі» («royal roads»), гаспадыня фермы – «каралева», пастухі – «арыстакратыя». У гэтым каралеўстве ўсё вымяраецца «бочкамі», «кашамі» («by the cartful, barrowful and bucketful»), што, безумоўна, сведчыць пра яго заможнасць. Але яго мінулае хавае і няўдачы, неўрадлівыя гады, падпалы, забойствы і г. д. Узнікае пытанне: толькі ферму мае на ўвазе пад сваім «каралеўствам» Ш. Хіні ці ўсю Ірландыю? Хутчэй за ўсё, і тое, і другое.

Тэматычныя лініі, у межах якіх адбываецца адлюстраванне ідэі нацыянальнай самасвядомасці ў паэзіі Шэймаса Хіні (лініі гістарычнага мінулага сваёй краіны, народнага побыту і міфалогіі і фальклору), з'яўляюцца скразнымі ў творчасці паэта, праходзячы шлях ад асобных матываў у першых зборніках да самастойнай тэмы ці нават лейтматыву ў творчасці пазнейшага перыяду. Найбольш значнае месца ў паэзіі

Репозиторий БрГУ

Шэймаса Хіні належыць тэмам гістарычнага мінулага і народнага побыту, у той час як міфалогія і фальклор амаль не прысутнічаюць у творчасці паэта ў выглядзе самастойнай тэматычнай лініі, а спалучаюцца з іншымі, дадаючы ім новае адценне. Гістарычнае мінулае радзімы адлюстроўваецца праз матыў раскопак у першым зборніку і паступова развіваецца, становіцца лейтматывам у зборніках «Узімку на свежым паветры», «Поўнач» і дасягае кульмінацыі ў сёмым зборніку «Востраў Стэйшн». Гэта лінія раскрываецца ў значнай ступені праз матыў багны (раскопак) і звязаныя з ім вобразы ахвяр старажытных рытуалаў і артэфакты, знойдзеныя ў зямлі. Народны побыт адлюстроўваецца праз вобразы блізкіх паэту людзей, апісанне навакольнага асяроддзя і тыповых заняткаў ірландцаў.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Heaney, S. Opened Ground: Selected poems 1966–1996 / S. Heaney. – New York, 2000. – 444 p.
2. Kiberd, D. Inventing Ireland: The Literature of the Modern Nation / D. Kiberd. – London : Vintage, 1996. – 719 p.
3. Vendler, H. Seamus Heaney / H. Vendler. – Cambridge, Massachusetts : Harward University Press, 1998. – 188 p.

Powkh I.V. **The Idea of National Identity Reflected in the Poetry of Seamus Heaney**

The article deals with the poetry of Seamus Heaney (b. 1939), the 20th century Irish poet, Nobel Prize laureate (1995). The poems of the 1960s – 1990s are analysed from the perspective of the main thematic lines, motifs and images as the means of reflection of the idea of national identity in Heaney's works. Three main thematic lines shown include: the historic past, everyday life and mythology and folklore. The motifs analysed are a bog motif, a digging motif, an environment motif, a loss and search motif, in particular, loss and search for the motherland, and others. The analysis reveals the priority of thematic lines, devoted to the historic past and everyday life, with mythology and folklore playing a secondary role in Heaney's poetry of the above-mentioned period.

Матэрыял паступіў у рэдкалегію 3.04.2008

Репозиторий БрГУ